**Новікаў С. Я.**

# ПЕРШЫЯ ТРЫ ДНІ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСІ ПАВОДЛЕ САВЕЦКАГА АФІЦЫЙНАГА НАРАТЫВУ І НЯМЕЦКІХ ДАКУМЕНТАЎ

З чым прыйшлі айчынныя даследчыкі да 80-х ўгодкаў з пачатку Вялікай Айчыннай вайны? На гэта прынцыпова важнае пытанне беларускім гісторыкам сёння неабходна даць адэкватны адказ, інакш шырокая чытацкая аўдыторыя будзе як і раней вывучаць сутнасць гістарычных падзей на беларускай зямлі ў чэрвеньскія дні 1941 г. выключна на традыцыйным савецкім наратыве, аснову якога складаюць галоўным чынам мемуары былых военачальнікаў. Ці змянілася сітуацыя ў сучасных навуковых даследаваннях, у якой ступені новыя веды картэлююць з крыніцамі, у тым ліку нямецкага паходжання. У такім ключы аўтар спрабуе знайсці адказ на пастаўленае вышэй пытанне і паказаць выключную важнасць звароту да новых дакументальных крыніц з выкарыстаннем адпаведных навуковых падыходаў.

З кароткага агляду навейшых прац на тэму абарончых баёў Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі ў першыя тры дні вайны становіцца відавочным, у беларускіх і расійскіх выданнях галоўнай асновай паказу гістарычных падзей па-ранейшаму застаюцца ўспаміны савецкіх военачальнікаў, без іх не выходзяць грунтоўныя навуковыя выданні ні ў Беларусі, ні ў Расіі [2; 5; 6]. Заўважым пры гэтым, што асабліва часта гісторыкі вайны звяртаюцца да ўспамінаў начальніка штаба 4-й арміі Заходняй асобай ваеннай акругі (ЗАВА) палкоўніка Л. М. Сандалава. З прадмовы яго кнігі «На московском направлении» вынікае, што дадзенае аўтарам *«описание оборонительного сражения советских войск на Западном стратегическом направлении – единственное в отечественной литературе по своей полноте и знанию дела»* [5, с. 3]. Між тым наколькі гэты і іншыя тэзісы мемуараў савецкага военачальніка, якія для айчыннага чытача падаюцца як строга навуковыя нарысы аб гісторыі 4-й арміі, адпавядаюць не толькі рэдакцыйным ацэнкам, колькі дакументальным крыніцам? Звернем у гэтай сувязі ўвагу чытача на выказванне аўтара ўнікальных мемуараў, які піша пра тое, што рэальную абстаноўку, якая склалася ў паласе арміі ў першыя дні вайны яму ўдалося устанавіць толькі пасля вайны шляхам вывучэння захаванай часткі савецкіх вайсковых і армейскіх дакументаў, успамінаў удзельнікаў падзей і трафейных дакументаў [5, с. 448].

Паводле звестак, адлюстраваных у мемуарах Л. М. Сандалава, карціна баявых дзеянняў, якія ў першыя дні вайны адбываліся ў Беларусі, была такой: *да зыходу 22. 06. 41 г. войскі 4-й арміі пад ударамі праціўніка адышлі ад дзяржаўнай граніцы на 25–30 км. Перадавыя часці 18-й нямецкай танкавай дывізіі прарваліся ўглыб нашай тэрыторыі на пружанскім напрамку амаль на 40 км. 3-я танкавая дывізія вяла бой у раёне Пілішчы, Падлессе і часткай сіл на поўнач ад Ратайчыц з 18-й і 17-й танкавымі дывізіямі 47-га нямецкага матарызаванага корпуса...75-я стралковая дывізія вяла бой на рубяжы Пажэжын, Маларыта, Хаціслаў з немецкімі 4-й танкавай, 1-й кавалерыйскай і 255-й пяхотнай дывізіямі* [5, с. 448–449].

Параўнаем гэту карціну з фактамі, зафіксаванымі ў дзённіку баявых дзеянняў 2-й нямецкай танкавай групы (2-я ТГр) [7], якая адпаведна плана "Барбароса" ў першы дзень наступлення павінна была прарваць пагранічныя ўмацаванні і фарсіраваць р. Заходні Буг па абодва бакі Брэст-Літоўска (Брэста), а потым забяспечыць наступленне танкавых часцей у раён Смаленска паўздоўж дзвюх танкавых трас (№ 1 і 2) на Слуцк і Мінск. Першаснай для групы з'яўлялася задача шляхам нанясенне імклівага ўдару на Мінск знішчыць пры ўзаемадзеянні з сіламі 3-й ТГр савецкія сілы ў раёне Беластока і Ваўкавыска, паля чаго без перапынку заняць раён Смаленска [8, Bl. 14]. З нямецкага боку перад непасрэднымі выканаўцамі ставіліся наступныя задачы:

24-у танкаваму корпусу (ТК) сіламі 255-й пяхотнай (ПД)[1] і 1-й кавалерыйскай (КД) і дзвюх танкавых дывізій (ТД) заняць плацдарм паабапал танкавай трасы № 1 паміж Кобрынам і р. Мухавец, потым узяць Кобрын і нанесці ўдар ў раён Слуцка;

12-у армейскаму корпусу (АК) узяць Брэст-Літоўск і зрабіць свабоднай для прасоўвання танкавых часцей трасу № 1 да моста на поўнач ад Булкава; пры гэтым корпус вядзе наступленне паміж дзвюма танкавымі трасамі;

47-у ТК нанесці ўдар сіламі дзвюх танкавых дывізій і дасягнуць трасу № 2. Асабліва важным бачыцца ўтрыманне непашкоджаным моста цераз р. Лясная.

Далей корпус наносіць удар ў напрамку Пружан, захоплівае пераправу цераз р. Ясельда і Шчара, захоплівае вузлавы пункт Баранавічы і прарываецца ў напрамку Мінска. Пры гэтым 167-я ПД разглядаецца як ударная сіла для наступлення цераз Буг, пасля чаго пераходзіць у падпарадкаванне 53-га АК.

[1] Параўнай: Гудериан Г. Воспоминания солдата / Г. Гудериан. – М. : Вече, 2012. – С. 169.



Репозиторий БрГУ

У якасці рэзерваў разглядаецца 46-ы ТК з улікам таго, што дывізія СС “Рэйх” можа прасоўвацца наперад за 24-м ТК на трасу № 1, а 10-я ТД і пяхотны полк “Вялікай Германія” у напрамку трасы № 2 непасрэдна за 47-м ТК [8, Bl. 15].

Паводле дзённых данясенняў, на 22 гадзіны 22. 06. 1941 г. складавалася наступная абстаноўка на лініі нанясення ўдараў кожнай з вышэйзгаданых нямецкіх часцей, то бок:

24-ы ТК: 255-я ПД дасягнула перадавым атрадам Ольтуз (за 13 км на захад ад Маларыты); 1-я КД веласіпедным падраздзяленнем знаходзіцца ў Збуражы (7 км на захад ад Маларыты), тады як сама дывізія падышла да Хвозніцы; 4-я ТД перадавым матацыклетным падраздзяленнем дасягнула перакрыжаванне за 12 км ад Маларыты, дывізія пачынае рух ад Арлянкі на ўсход; 3-я ТД прайшла пункт Гузні (3 км на ўсход ад Брэст-Літоўска) і знаходзіцца на маршы да трасы № 1 [9, Bl. 26];

12-ы АК дасягнуў Жабінкі перадавым разведвальным падраздзяленнем. 34-я ПД знаходзіцца лініі Булкава (15 ум на ўсход ад Брэст-Літоўска) – Навасады – Пжэснае; 31-я ПД дывізія за 9 км ад Булкава; 45-я ПД – пад Цытадэллю.

47-ы ТК: 18-я ТД сіламі танкавай брыгады пад Паддубна (20 км на паўднёвы захад ад Пружан); 17-я ТД каля моста на р. Лясная ў раёне Рудаўца (22 км на поўнач ад Брэста); 29-я ПД (матарызаваная) знаходзіцца на маршы.

Намер 2 ТГр – у ноч з 22 на 23 чэрвеня заняць участак на р. Ясельда (90 км на паўночны ўсход аб Брэст-Літоўска), а 23 чэрвеня заняць участак на р. Шчара [9, Bl. 27].

Такім чынам, зварот да дакументальных крыніц нямецкага паходжання дазваляе даследчыку наблізіцца да канкрэтных фактаў, паказаць іх прывязцы да дакладных назваў беларускіх населеных пунктаў, убачыць хоць частку гістарычнай карціны баявых падзей, якія адбываліся ў першы дзень вайны на Берасцейшчыне. Але ў прапанаваным матэрыяле ход рэальных падзей разглядаецца на аснове выкарыстання дакументальных крыніц процілеглага боку, у нашым выпадку нямецкіх.

Журнал баявых дзеянняў камандуючага 2-й ТГр генерал–палкоўніка Г. Гудэрыяна дазваляе ў хinduced налагічнай паслядоўнасці ўбачыць не толькі ход баявых дзеянняў, але і пазнаёміцца з вынікамі іх вядзення нямецкімі часцямі. Заўважым, што ў дачыненні да кожнай падзеі прыведзены зыходныя дакументальныя матэрыялы (загады, данясенні, паведамленні, радыёграмы і інш.), г. зн. першасныя крыніцы, на падставе якіх пісалася карціна баявой паўсядзённасці на тэрыторыі Берасцейшчыны ў чэрвені 1941 г. Нагадаем, што ў канцы другога дня вайны назіральны пункт камандуючага быў размешчаны ў палацавым парку Пружан, дзе знаходзіўся да 5 гадзіна раніцы 26 чэрвеня і дзе на аснове дакументальнага адлюстравання складвалася агульная мазаіка баявых падзей паміж часцямі германскага вермахта і Чырвонай арміі. У журнале адзначаецца, што ў тыя дні стаяла сухое летняе надвор’е.

Звернемся да наступнага франтавога дня баёў, якія знайшлі адлюстраванне ў мемуарах Л. М. Сандалава: *У 6 гадзін раніцы 23. 06. 41 г. часці 14-га механізаванага корпуса, 28-га стралковага корпуса і 75-й стралковай дывізіі пачалі контратакі супраць часцей 47-га і 24-га матарызаваных і 12-га армейскага нямецкіх карпусоў. Аднак на іншых участках праціўнік, падтрыманы сканцэнтраваным артылерыйскім агнём і авіяцыяй, перайшоў у наступленне і сваімі танкавымі дывізіямі пачаў хутка прасоўвацца ў напрамку Кобрына і Пружан. Пад ударамі 3-й і 4-й танкавай, 31-й і 34-й пяхотных нямецкіх дывізій, якія наступалі паўздоўж Варшаўскай шашы, у раён Кобрына пачала адыходзіць групоўка савецкіх войск. Пасля 16-й гадзіны 3-я танкавая дывізія захапіла ў Кобрыне мост цераз р. Мухавец* [*5, с. 456, 460, 461].*

Параўнаем гэтыя падзеі з дакументальнымі звесткамі, які вынікаюць з дзённіка баявых дзеянняў 2-й ТГр у дачыненні да другога дня вайны. Паводле ранішніх паведамленняў, першыя ўдары нямецкай авіяцыі на Маларыту, дзе былі сканцэнтраваны значныя сілы Чырвонай арміі, былі нанесены ў 5. 30. З 5. 45 да 6. 10 праходзіў нямецкі артылерыйскі абстрэл Пружан, у раёне якіх знаходзілася часці 18-й нямецкай ТД [10, Bl. 30]. А 8-й гадзіне перадавое падраздзяленне гэтай дывізіі пранікае ў лясны масіў Ружанскай пушчы на глыбіню да 3 км (за 25 км на паўночны ўсход ад Пружан). Паводле данясення, да 11-й гадзіны часці гэтай дывізіі захапілі Пружаны, пасля чаго быў камандуючым быў аддадзены загад аб перамяшчэнні палявога штаба танкавай групы ў Пружаны. Яшчэ раней паступіла данясенне 24-га ТД аб тым, што а 8-й гадзіне раніцы быў захоплены Кобрын.

У другой палове дня паступаюць данясенні, паводле якіх 1-я КД і 255-я ПД вялі наступленне на ворага ў раёне Збуража – Маларыты. 3-я ТД пачала марш ад Горска (33 км на паўночны ўсход ад Кобрына) у напрамку на Бярозу Картузскую. 12-ы АК вядзе баі ў раёне Жабінкі, 47-ы ТК – у раёне Більдзекі (за 22 км на паўночны ўсход ад Брэст-Літоўска). 18-я ТД рухаецца на Ружаны, 17-я прасоўваецца на поўнач ад трасы № 2 па дарозе Пружаны – Лыскаў.

Канчатковую карціну баявых падзей на другі дзень вызначаюць вячэрнія данясенні ў штаб 2-й ТГр, паводле якіх; 24-ы ТК знаходзіўся на баявых пазіцыях у раёне Бярозы Картузскай; 255-я ПД наступала ў напрамку на участак ручая за 6 км на паўднёвы захад ад Маларыты; у раёне Збуража – Маларыты сілам 1-й КД і 255-й ПД аказвалі ўпартае супраціўленне савецкія часці сіламі каля дывізіі;



Рэпазіторый ВДУ

4-я танкавая дывізія знаходзілася каля Кобрына і на ўсход ад Меднае (за 24 км на поўдзень ад Брэст-Літоўска). 3-я ТД захапіла Бярозу Картузскую ў 16. 30 з лёгка пашкоджаным мостам і наносіць далейшы ўдар у напрамку на р. Шчара.

Па выніках двухдзённых баяў 2-й ТГр на Берасцейшчыне паведамлялася, што за гэты час былі знішчаны 220 савецкіх танкаў, прычым 110 з іх толькі адным узмоцненым танкавым палком 18-й ТД [10, Bl. 34].

Трэці дзень вайны знаходзіць наступнае адлюстраванне ў мемуарах Л. М. Сандалава. *Раніцай 24. 06. 41 г. пасля авіяцыйнай і артылерыйскай падрыхтоўкі часці 3-й і 4-й танкавых дывізій 24-га нямецкага матарызаванага корпуса прарвалі слабую абарону нашых войск на рубяжы р. Ясельда. На баранавіцкім напрамку ў раёне Слоніма праціўнік упершыню сустрэў арганізаванае супрацьдзеянне савецкіх войск, і гэты дзень не прынёс чакаемага поспеху 47-му нямецкаму матарызаванаму корпусу [5, с. 470, 476].*

А вось як гэты дзень адлюстраваны ў данясеннях вермахта. З ранішніх данясенняў (па стану на 5. 30) 3-я ТД 24-га ТК здолела на працягу ночы без баёў стварыць плацдарм за р. Шчара, адкуль дывізія а 4-й гадзіне раніцы пачала рух на Слуцк. Пры гэтым 4-я ТД збіраецца ў раёне Кобры для таго, каб рушыць далей за 3-й дывізіяй. 12-ы АК дасягнуў папярэднім вечарам Бярозу Картузскую, пры гэтым 34 і 31-я ПД выйшлі на лінію Кобрын – Легаці (5 км на паўночны захад ад Кобрына) – Ластаўкі (11 км на паўночны захад ад Кобрына). 17 і 18-я ТД 47-га ТК з 4. 30 гадзін вядуць бai за плацдарм у раёне Слоніма. У 7. 23 і 7. 35 па радыё паступаюць загады: 24-ы танкавы корпус рухаецца далей на Слуцк; кавалерыйская дывізія пакідае Маларыту і падцягваецца; сам корпус авалодвае раёнам р. Шчара. 47-ы ТК бярэ Слонім, наносіць удар на Барановічы. 5-ы кулямётны батальён вядзе флангавую абарону Зельвянкі, галоўная кропка Зэльва. 29-я ПД (матарызаваная) як мага хутчэй авалодвае Пружанамі, Ружанамі [11, Bl. 37].

Каля 10-й гадзіны 1-я КД пасля паветранага ўдару авіяцыі займае Маларыту, дасягае Дзівін і на працягу сярэдзіны дня наступае далей. Паводле радыёданясення ад 47-га ТК, танкавы ўдар 17-й дывізіі адбіты. У 7. 20 заняты плацдарм на поўначы Слоніма. З 10. 00 18-я танкавая дывізія вядзе атаку на паўднёвую частку горада. Праз гадзіну пакідае горад і выступае ў напрамку Баранавіч. У другой палове дня (16. 23) камандуючы 2-й ТГр аддае загад 17-й ТД аб ліквідацыі небяспекі, якая ўзнікла з боку праціўніка на трасе на поўнач ад Слоніма ачыстцы, тады як 18-я ТД працягвае весці наступленне на Баранавічы. Пры гэтым камандуючы даводзіць да ведама, што значныя сілы праціўніка адыходзяць ад Ваўкавыска [11, Bl. 38].

У 17. 05 па радыё паступае загад ад камандзіра 47-га ТК камандаванню аб тым, што праціўнік акружае Слонім з захаду і поўдня танкавымі сіламі, таму 18-й МД неабходна неадкладна правесці адцягваючую атаку. Па стане на 18. 00 з данясенняў бачна агульнае становішча 2-й ТГр.

24-ы ТК: 1-я КД знаходзіцца на маршы з Дзівіна на Кобрын: 4-я ТД пачала далейшы рух ад Кобрына; 3-я ТД дасягнула па трасе № 1 населены пункт Марынава (за 22 км на поўдзень ад Баранавіч).

12-ы АК паведамляе аб цяжкім маршы наперад пры слабым процідзеянні праціўніка; 34 і 31-я ПД дасягнулі да 12. 00 лініі Лушчыкі (12 км на паўночны ўсход) – Харкі (21 км на поўнач ад Кобрына).

47-ы ТК: 18-я ТД вядзе баі на танкавай трасе № 2 за 15 км на ўсход ад Слоніма; 17-я ТД і 5-ы кулямётны батальён стварылі лінію абароны на ўчастку Слонім – Зельвянка – участак на поўнач і захад; 29-я ПД (матарызаваная) а 16-й гадзіне пачынае перамяшчэнне на трасу № 2 з раёна Пружан.

У дзённіку запісана, што ўзмацнілася дзейнасць савецкай авіяцыі, процістаяць якой не стае сіл па прычыне недахопу паліва. Камандаванне 2-й ТГр мае намер працягнуць наступленне на Слуцк і Мінск [11, Bl. 39].

А 21-й гадзіне прыходзіць загад камандуючага 2-й ТГр у дачыненні да наступных сутак 24 /25. 06. 1941 г. У загадзе адзначаецца, што значныя сілы праціўніка адыходзяць з Ваўкавыска на Слонім. З улікам сітуацыі галоўныя сілы 47-га ТК будуць задзейнічаны пад Слонімам. 24-ы ТК заняў раён на паўднёвы ўсход ад Баранавіч. Ставяцца наступныя баявыя задачы:

24-ы ТК трымае сіламі 3 і 4-й ТД раён на поўдзень ад Баранавіч з улікам таго, каб пры першай жа магчымасці можна было выступіць у напрамку Слуцка або Баранавіч. Правесці баявую разведку ў напрамку Слуцка;

47-ы ТК адкідвае назад з раёна Ружаны – Слонім – Зэльва на захад рускія сілы, якія адышлі сюды з-пад Ваўкавыска, далей блакуе невялікімі сіламі ўчастак Зяльвянка – Ражанка і выступае асноўнымі сіламі ў напрамку Нясвіжа;

46-ы ТК рушыць па абедзвюм трасам з дывізіяй СС "Рэйх" за 24-м танкавым корпусам, а 10-й ТД за 47-ым ТК. Падраздзяленне знішчальнікаў танкаў 10-й ТД адпраўляецца неадкладна ў распараджэнне групы;

12-ы АК наступае далей цераз участак р. Ясельды на ўчастак р. Шчара і праводзіць зачыстку паміж дзвюма танкавымі трасамі.

У якасці галоўных напрамкаў баявой дзейнасці нямецкае камандаванне вызначае: 1) баі ў раёне р. Прыпяць; 2) пачатак пераследу праціўніка ў напрамку р. Беразіна; 3) разгортванне бітвы пад Беластокам і Слонімам [11, Bl. 39–40].

Такім чынам, праведзенае даследаванне двухбаковых баявых дзеянняў у першыя тры дні вайны на тэрыторыі Беларусі сведчаць аб важнасці выкарыстання новых навуковых падыходаў для аб'ектыўнага асвятлення пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Матэрыял паказвае. што нельга нічым замяніць дакументальныя звесткі, незалежна ад таго, у якіх гістарычных крыніцах яны адлюстраваны. Разгляд канкрэтных гістарычных фактаў, замацаваных у дзённіку баявых дзеянняў 2-й нямецкай ТГр, і тых гістарычных звестак, якія згаданы ва ўспамінах начальніка штаба 4-й арміі палкоўніка Л. М. Сандалава, пераконвае чытача ў тым, што больш дакладная карціна баявых падзей, што разгортваліся ў першыя тры дні вайны, пачала складацца нямецкімі храністамі, якія ў канкрэтнай прывязцы да мясцовасці і дакладнага часу паказвалі, з аднаго боку, ход наступлення часцей германскага вермахта, а з другога – вызначалі дакладныя рубяжы абароны Чырвонай арміі ў прывязцы да беларускіх населеных пунктаў і геаграфічных назваў. Як бачна, выкарыстанне нават гэтых даных павялічвае магчымасці для як пашырэння канкрэтных гістарычных фактаў, ўдакладнення геаграфічных рубяжоў адступлення савецкіх часцей, так і самае істотнае – паглыблення ведаў аб асобных баявых падзеях у першыя тры дні вайны на тэрыторыі Беларусі.

У той жа час узнікаюць новыя пытанні даследчыцкага кшталту, напрыклад: на што ў далейшым неабходна абапіраліся гісторыкам пры навуковай верыфікацыі гістарычных падзей; ці можна шырока выкарыстоўваць звесткі, калі яны не прайшлі адпаведны навуковы аналіз ў працах прафесійных даследчыкаў, але зноў і зноў паўтараюцца ў публікацыях рознага кшталту? Аб важнасці навуковай верыфікацыі фактаў на прыкладзе мемуарнай літаратуры ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі ўжо распачаты неабходны навуковы дыскурс [1; 3; 4], працяг якога дасць магчымасць не толькі адказаць на пастаўленае вышэй прынцыпова важнае пытанне, але і на навуковых падыходах стварыць каркас праверанага гістарычнага наратыву з апорай на аб'ектыўныя веды аб гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.


1. Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / сост.: К. Ганцер [и др.]. – 2-е изд., испр. – Смоленск : Инбелкульт, 2017. – 728 с.
2. Великая Отечественная война 1941–1945 годов : в 12 т. – Т. 2 : Происхождение и начало войны. – М. : Кучково поле, 2012. – 1008 с.
3. Новікаў, С. Я. Летнія баі 1941 г. на Беларусі ў мемуарах Г. Гудэрыяна і дзённіку баявых дзеянняў 2-й танкавай групы: спроба кампаратыўнага аналізу // С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2014. – № 5. – С. 33–41.
4. Новікаў, С. Я. Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў. – 2-е выданне, выпраўленае, дапоўненае / С. Я. Новікаў. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 436 с.
5. Сандалов, Л. М. На московском направлении / Л. М. Сандалов. – М. : Вече, 2010. – 576 с.
6. 1941 год: Страна в огне : в 2 кн. – Кн. 1 : Очерки. – М. : ОЛМА Медиа Групп, 2011. – 720 с.
7. Федэральны ваенны архіў Германіі (далей – BA-MA). Ostfeldzug: KTB der 2. Pz. Armee v. 22. 6. –20.8.1941. – RH 21–2 /927. – Bl. 1–280.
8. BA-MA. Darstellung der Ereignisse am 21.06.1941. – RH 21–2 /927. – Bl. 11–17.
9. BA-MA. Darstellung der Ereignisse am 22.06.1941. – RH 21–2 /927. – Bl. 20–27.
10. BA-MA. Darstellung der Ereignisse am 23.06.1941. – RH 21–2 /927. – Bl. 30–35.
11. BA-MA. Darstellung der Ereignisse am 24.06.1941. – RH 21–2 /927. – Bl. 37–41.


**Крыварот А. А.**

## АРХІЎНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЯК ВАЖНАЯ КРЫНІЦА ДАСЛЕДАВАННЯ БАЯВОЙ САДРУЖНАСЦІ САВЕЦКІХ ПАРТЫЗАН НА ВІЦЕБШЧЫНЕ (1941–1942 ГГ.)

Тэрыторыя Віцебшчыны ў гады вайны стала месцам сумеснага змагання партызан Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы супраць германскіх акупантаў. Інфармацыя аб формах узаемадзеяння партызан суседніх рэспублік утрымліваецца ў дакументах фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ), у тым ліку 4п, 1336, 1391, 1450: данясеннях, рапартах, журналах баявых дзеянняў, баявых распараджэннях, справаздачах, даведках, лістах-допытах і. г.д. Пад тэрмінам «Віцебшчына» неабходна разумець сучасную тэрыторыю Віцебскай вобласці.

У фондах НАРБ аб узаемадзеянні савецкіх партызан на тэрыторыі Віцебшчыны ў першы год вайны захоўваюцца нешматлікія архіўныя звесткі, і датычацца яны ўсходніх раёнаў. Інфармацыя адносіцца да сумеснай дзейнасці са спецпадраздзяленнямі, якія былі закінуты на ўсход рэгіёна з савецкага тылу летам – восенню 1941 г. Самы ранні такі факт змешчаны ў фондзе 1391 (воп. 1, спр. 136), дзе захоўваецца пасляваенны ліст камандзіра разведгрупы М. І. Кавалёва. Дакумент

Рэпазіторый ВДУ